КРЫНІЦА

СПЕЦВЫПУСК 2011 www.bchd.info

НАРОДНАЯ ПАРТЫЯ З ХРЫСЦІЯНСКІМ СЭРЦАМ



СТРАТЭГІЧНАЕ БАЧАННЕ БХД

1) КАШТОЎНАСЦІ І ПРЫНЦЫПЫ ПАРТЫІ БХД

ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАШТОЎНАСЦІ — АСНОВА ПАЛІТЫЧНАГА ПАРАДКУ

Свой шлях мы выбіраем самі, на слушнасць яго правяраем згодна з хрысціянскімі каштоўнасцям, якія даўно ўжо сталі агульначалавечымі каштоўнасцямі. Яны даюць уяўленне пра прынцыпы справядлівага праўлення, заснаванага на перавазе духоўнасці над матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

СВАБОДНАЯ АСОБА — АСНОВА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

Усялякае чалавечае разуменне недасканалае, таму ніхто не можа навязваць свае погляды іншаму. Правы і свабоды кожнага чалавека на ўладкаванне свайго уласнага жыцця абмяжоўваюць нашы магчымасці па пабудове Беларусі. Гэтае адзінае абмежаванне мы лічым сапраўдным і справядлівым. Тое, што гэтае абмежаванне адзінае, але непарушнае, мы лічым дабром. Грамадства і дзяржава служаць чалавеку і існуюць дзеля стварэння ўмоў, неабходных для

яго самарэалізацыі. Грамадства і чалавек павінны знаходзіцца ў стане балансу і ўзаемнага дапаўнення.



НЕ НАРОД, А НАЦЫЯ

Беларусы павінны перайсці на наступную прыступку будаўніцтва сваёй нацыянальнай дзяржавы ад народа, які аб'ядноўвае толькі агульнасць тэрыторыі, да нацыі свабодных грамадзян, якія нясуць адказнасць за сваю краіну і яе будучыню. А неад'емнай складовай часткай нацыі ёсць нацыянальныя меньшасці, што пражываюць на тэрыторыі краіны. Іх права на захаванне самабытнай культуры, адукацыю, свабоду аб'яднанняў мусіць быць непарушным. Мы нарадзіліся ў Беларусі, гэта наша краіна, і ніхто акрамя нас не ўладкуе яе так, як нам трэба. Беларусь – гэта наша свабода, свабода жыць і дзейнічаць у адпаведнасці з нашым разуменнем праўды, дабра, прыгажосці і справядлівасці. Дзяржава не мае права накладаць абмежаванні на справядлівыя патрабаванні асобы, аднак яна павінна абараняць адных чальцоў грамадства ад шкоды, звязанай з прыватнымі інтарэсамі іншых. Яна можа выкарыстоўваць сваю ўладу толькі ў той меры, у якой гэта неабходна для агульнага дабра. Дзяржава не мае права вырашаць задачы, адказнасць за якія ляжыць на сям'і, царкве і іншых грамадскіх структурах.

АГУЛЬНАЕ ДАБРО І САЦЫЯЛЬНАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

Народная партыя БХД выступае за стварэнне ў Беларусі сацыяльна-арыентаванай дзяржавы, дзе галоўным прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца годнае жыццё кожнага грамадзяніна, дзе асаблівая ўвага надаецца развіццю грамадскай салідарнасці, падтрымцы маламаёмных і людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Усе людзі ад прыроды роўныя і таму маюць роўнае права на павагу і на ўдзел у жыцці грамадства.



САЛІДАРНАСЦЬ

У грамадстве заўсёды будуць існаваць канфлікты інтарэсаў сярод розных груп грамадзян, таму пабудова ідэальнага грамадства на зямлі немагчымая. Партыя БХД бачыць місію кожнага грамадзяніна не ў канкурэнцыі з іншымі людзьмі, а ў самарэалізацыі грамадзяніна як чальца грамадства перш за ўсё за кошт натуральных і элементарных ячэек грамадства, такіх як сям'я, царкоўная супольнасць, мясцовае і прафесійнае згуртаванне, валанцёрская арганізацыя.

СУБСІДЫЯРНАСЦЬ

Партыя БХД выступае за максімальную дэцэнтралізацыю усіх структур беларускага грамадства, у тым ліку урадаў, партый, недзяржаўных арганізацый, дзяржаўных і прыватных карпарацый, прафсаюзаў. Улада павінна быць як мага бліжэй да грамадзян: да адказнасці структур верхняга ўзроўню павінны адносіцца толькі тыя пытанні, якія немагчыма вырашыць на больш нізкім узроўні. Грамадства і дзяржава павінны браць на сябе вырашэнне толькі тых пытанняў, з якімі асобны чалавек справіцца не ў стане.

САЦЫЯЛЬНА-АРЫЕНТАВАНАЯ РЫНКАВАЯ ЭКАНОМІКА

Народная партыя БХД выступае за прыватную ўласнасць, у тым ліку і на зямлю. Паўнавартаснае развіццё асобы немагчыма без свабоды выбару працоўнага месца і свабоды прадпрымальніцкай дзейнасці, аднак ні дзяржава, ні прыватны бізнэс не маюць права мець поўны кантроль над эканомікай і павінны служыць людзям. Дэмакратычнае патрабаванне падсправаздачнасці распаўсюджваецца на прыватных асоб, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках уладу і багацце. Толькі рашэнні саміх спажыўцоў, пастаўшчыкоў рэсурсаў і прыватных фірмаў вызначаюць структуру размеркавання рэсурсаў. Пры гэтым эканамічна больш моцныя абавязаны падтрымліваць больш слабых. У абавязкі дзяржавы ўваходзіць развіццё пачуцця ўзаемнай адказнасці ўсіх удзельнікаў на рынку (у тым ліку, перад будучым пакаленнем) і карэкціроўка несправядлівых тэндэнцый у гандлі, канкурэнцыі і размеркаванні даходаў.



БЕЛАРУСЬ – ЕЎРАПЕЙСКАЯ НАЦЫЯ


Беларусь - неад'емная частка агульнаеўрапейскай геаграфічнай, палітычнай і культурнай прасторы. Інтэграцыя Беларусі ў еўрапейскую супольнасць бачыцца намі як адна са стратэгічных задач нацыянальнай палітыкі.

2) МІСІЯ ПАРТЫІ БХД









Місія Партыі БХД палягае ў садзейнічанні маральнаму, духоўнаму, нацыянальнаму, палітычнаму і эканамічнаму адраджэнню беларускай нацыі, выхаванню духоўна багатай, свабоднай і развітай асобы. Народная партыя БХД прапануе беларускаму грамадству рэалізаваць мадэль палітычнай сістэмы дзяржавы і грамадства ў адпаведнасці з хрысціянскімі і агульначалавечымі каштоўнасцямі, і дае прыклад палітычнай культуры, заснаванай на дэмакратычных каштоўнасцях. Хрысціянскія дэмакраты выступаюць за фарміраванне ў Беларусі эканамічнай сістэмы, арганізаванай на аснове рынкавай самарэгуляцыі, каардынацыя дзеянняў якой ажыццяўляецца на аснове ўзаемадзеяння на рынках свабодных прыватных вытворцаў і свабодных індывідуальных спажыўцоў. Хрысціянскія дэмакраты выступаюць за фарміраванне ў Беларусі эканамічнай сістэмы, арганізаванай на аснове прынцыпаў сацыяльнай рынкавай эканомікі.

Хрысціянская дэмакратыя прадугледжвае напаўненне дэмакратычным і духоўным зместам ўсіх сфер грамадскага і асабістага жыцця. Хрысціянская дэмакратыя немагчымая без палітычнай дэмакратыі, гэта значыць існавання прававо́й дзяржавы, дзе выконваюцца правы і свабоды, абвешчаныя ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, а таксама эканамічнай дэмакратыі, якая прадугледжвае дэмакратызацыю ўсяго гаспадарчага механізму, стварэнне дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту праз сацыяльна-арыентаваную рынкавую эканоміку, фарміраванне сацыяльнага партнёрства.

Партыя БХД выступае за пабудову незалежнай, дэмакратычнай і прававой дзяржавы Рэспубліка Беларусь з выкарыстаннем негвалтоўных метадаў палітычнага ўдзелу, і імкнецца да стварэння гуманнага свабоднага грамадства, заснаванага на трывалым падмурку хрысціянска-дэмакратычных каштоўнасцяў.

Стратэгічным прыярытэтам БХД з'яўляецца дэмакратызацыя палітычнай сістэмы Беларусі, прыход да ўлады хрысціянскіх дэмакратаў, фарміраванне хрысціянска-дэмакратычнага альбо кааліцыйнага ўраду і правядзенне дэмакратычных рэформаў на грунце хрысціянска-дэмакратычнай платформы, інтэграцыя Беларусі ў еўрапейскую супольнасць.

Асноўным прыярытэтам Партыі БХД на 2011-2012 год з'яўляецца ўзмацненне Партыі, як у колькасным, так і ў якасным вымярэнні, а таксама выпрацоўка адзінай пазіцыі і плана дзеянняў дэмакратычных сілаў Беларусі.






3) МЭТЫ ПАРТЫІ БХД:

Партыя БХД лічыць, што для дасягнення нашых стратэгічных прыярытэтаў мы павінны дасягнуць наступных мэтаў:


1. Павялічыць колькасць сябраў партыі да 5 тыс. чалавек і прыхільнікаў да 10 тыс. на працягу двух гадоў. Павялічыць падтрымку Партыі БХД у беларускім грамадстве і / ці яе нацыянальных / рэгіянальных лідараў на ўзроўні не менш за 5% ды канца 2012 года, 7% да канца 2013 года.
2. Скарэктаваць імідж партыі як масавай партыі правацэнтрысцкай арыентацыі сярод насельніцтва шляхам стварэння альтэрнатыўнай праграмы рэфармавання на прынцыпах сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі, а таксама правядзення кампаній, накіраваных на вырашэнне сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем грамадства.
3. Завершыць інстытуцыянальнае афармленне партыі праз атрыманне афіцыйнай рэгістрацыі партыі.
4. Удасканаліць арганізацыйную структуру партыі праз падрыхтоўку прафесійных мэнэджэраў у рэгіянальных арганізацыях.
5. Узмацніць партыйны ўплыў на грамадскую думку з дапамогай актыўнай прысутнасці ў сацыяльных сетках і Інтэрнэце, выдання штомесячнага партыйнага бюлетэня і інфармацыйнага выдання для непартыйны аўдыторыі, актыўнай прысутнасці ў інфармацыйным полі незалежных сродкаў масавай інфармацыі.
6. Распрацаваць і ажыццявіць план па прыцягненні сродкаў як з унутраных, так і знешніх крыніц для забеспячэння бесперабойнага фінансавання партыйнай дзейнасці і рэалізацыі пастаўленых у гэтай стратэгіі задач.
7. Палепшыць разуменне сябрамі партыі таго, што такое Хрысціянская Дэмакратыя і партыйная ідэалогія праз правядзенне навучальных семінараў для новых сябраў партыі ў межах партыйнай школы.
8. Як народная партыя БХД пакліканая яднаць усе сілы, якія стаяць на грунце каштоўнасцяў народнасці, персаналізму і субсідыярнасці на ўсіх узроўнях. У перспектыве БХД бачыцца нам як сэрца вялікай беларускай народнай сілы, хрысціянска-дэмакратычнай і кансэрватыўнай паводле характару. Цягам бліжэйшага часу неабходна ўзмацніць падтрымку дэмакратычных пераменаў у беларускім грамадстве праз стварэнне шырокай кааліцыі дэмакратычных сіл і забеспячэнне яе эфектыўнага функцыянавання, каардынацыю сумеснай дзейнасці суб’ектаў кааліцыі і правядзенне сумесных агульнанацыянальных палітычных кампаній, а таксама актыўную міжнародную дзейнасць партыі.
9. Актывізаваць працу з еўрапейскімі партнёрамі Партыі БХД для выпрацоўкі канкрэтнай пазіцыі і прапаноў з боку еўрапейскіх краін беларускаму грамадству, што будзе спрыяць росту колькасці прыхільнікаў інтэграцыі ў еўрапейскую супольнасць і іх кансалідацыі.
10. Да наступнага З’езду стварыць структуры БХД у кожным раёне Беларусі. Пашырыць праект «Рада Народных дэпутатаў» на ўсе суполкі БХД.

17.12.2011, Менск



СТРАТЭГІЧНЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ БХД НА 2012-2013

1) НАРОДНАЯ ПАРТЫЯ І ХРЫСЦІЯНСКАЕ ПАГЛЫБЛЕННЕ



Вырашэнне дзвюх стратэгічных задач БХД – пашырэнне да маштабаў сапраўды народнай масавай партыі і паглыбленне хрысціянскага духу БХД – справа няпростая: звычайна іх схільныя супрацьпастаўляць. Але паспяховыя прыклады хрысціянскіх дэмакратаў Еўропы паказваюць, што аптымальная мадэль – глыбокае сумяшчэнне абодвух гэтых накірункаў. Як Божае і чалавечае (ва ўсім, акрамя грэху) поўнасцю сумясцілася ў Госпадзе нашым Ісусе Хрысце – так і мы, і як асобы, і як сіла, павінныя імкнуцца да выяўлення Хрыстовага вобразу мыслення і дзеяння, у актыўным пашырэнні БХД ў гушчыні беларускага народу.

Лідары БХД мусяць успрымаць канструктыўную крытыку, чуць альтэрнатыўную думку, прапаноўваць шлях рэальнага ўмацавання хрысціянскага характару БХД (кампанія ў абарону сям»і, рэкамендацыі для кіраўнікоў усіх узроўняў, навучанне і г.д.).

Ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу расквітнеў алкагалізм, рэзка узрасла колькасць абортаў і разводаў. БХД павінна з дапамогай цэркваў зноў шырока разгарнуць нацыянальную кампанію ў абарону маральных каштоўнасцяў «Моцная сям'я – моцная Беларусь».

У назве Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, у цэнтры, у сэрцы – імя Хрыста, і гэта надае нам з вамі невымернай адказнасці.

«Народная партыя з хрысьціянскім сэрцам» – прапаную гэта дэвізам З'езду.

2) ЯДНАННЕ НАРОДНЫХ СІЛАЎ

Як народная партыя, БХД пакліканая яднаць усе сілы, якія стаяць на гунце каштоўнасцяў народнасці, персаналізму і субсідыярнасці – МФ, БНФ, АГП, РЗС, «Разам» – на ўсіх узроўнях.



У перспектыве БХД бачыцца нам як сэрца вялікай беларускай народнай сілы, хрысціянска-дэмакратычнай і кансэрватыўнай паводле характару. А зараз, ва ўмовах усебаковага крызісу і закасцянення рэжыму, мы пакліканыя найперш наладжваць гарызантальныя сувязі ў пакуль сырой тоўшчы беларускага грамадства.

Народнае абурэнне само па сабе ні ўва што не выліваецца, проста паціху гніе ўнутры. Сістэма вышчамляе здольных да дзеяння паасобку — вылічвае, атачае і разам націскае на ўсе рычагі, каб чалавек адчаяўся. Беларусы такія засяроджаныя і такія незадаволеныя, што не заўважаюць нават уласнай большасці.

Перапрус у кватэры сеткавага рэвалюцыянера — усе вернікі, прадпрымальнікі, рабочыя і, вядома, праваабаронцы збіраюцца там. Незалежным журналістам далі суткі — сто чалавек нясуць перадачы, шлюць тэлеграмы, дапамагаюць сям'і. Падтрымка ператвараецца ў акцыю ў любым месцы і ў любы час, у кожным выпадку — каб пераслед за «масавае бяздзеянне» страціў сэнс. Салідарнасць як адказ на рэпрэсіі хутка нараджае салідарнасць як ініцыятыву, рух, які немагчыма пракантраляваць, рух, залежны ўжо не ад дробнапалітычнай сумятні, а (ні больш, ні менш) ад волі народа.

Найважнейшай справай сённяшняга дня застаецца вызваленне палітвязняў. БХД мусіць аддаць усе сілы дзеля арганізацыі моцнай кампаніі салідарнасці, найперш з сябрамі партыі Яўгенам Васьковічам, Змітром Дашкевічам, Эдуардам Лобавым. Адзін за ўсіх – і ўсе за аднаго! Толькі калі кожны хрысціянскі дэмакрат будзе падтрымліваць таго, хто пад ударам, БХД зможа стаць рухавіком агульнабеларускай салідарнасці. Галоўнае – дапамога з адвакатам, збор сродкаў для сем'яў, малітва, лісты і акцыі, арганізацыя візіту святароў да вязняў, збор

подпісаў-паручальніцтваў, праваабарончыя форумы.

Адзін за ўсіх — паводле такога правіла 2000 гадоў таму перамог Ісус. Нам засталося толькі падхапіць: і ўсе за аднаго!

3) БХД – У КОЖНЫМ РАЁНЕ!

Пасля шырокіх кампаніяў 2010 г. БХД падтрымалі сотні людзей нават у тых раёнах, дзе мы не мелі супольнасцей. Гэта ўнікальны рэсурс – і цяпер перад намі цалкам выканальная задача да наступнага З'езду стварыць структуры БХД *у кожным раёне* Беларусі. Пакуль у нас ахоплена 87 раёнаў са 118 (каля 70%), найбольш паспяхова на Гарадзеншчыне і Віцебшчыне. Гэта справа найперш рэгіянальных каардынатараў і мясцовых лідараў БХД.

Адна з ключавых справаў БХД у 2012-2013 годзе – наша паспяховая праграма «Народны дэпутат». Трэба пашырыць праект «Народнага дэпутатства» на ўсе суполкі БХД: хрысціянскія дэмакраты мусяць найперш думаць пра інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. «*Калі хто хоча быць сярод вас першым – хай будзе ўсім слугою*».



4) АНТЫКРЫЗІСНАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПЛАТФОРМА БХД

БХД прапануе беларускаму грамадству свой адказ на крах эканамічнай мадэлі рэжыму:

1. Адстаўка ўраду.
2. Амністыя асуджаным за эканамічныя злачынствы. Адмена крымінальнага пераследу за, нібыта, «эканамічныя злачынствы» (часцей за ўсё матывацыя парушэнняў - выжыванне ў карупцыйным свеце). Амністыя некрымінальнага капіталу. Крымінальны пераслед у эканамічнай сферы захаваць для карупцыянераў і хабарнікаў.
3. Увядзенне Надзвычайнага Эканамічнага Становішча. Стварэнне Надзвычайнага Эканамічнага Камітэта з запрашэннем незалежных эканамістаў і экспертаў. Публічнае абмеркаванне эканамічных рашэнняў. Круглыя сталы. Упаўнаважыць НЭК весці перамовы з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі.
4. На працягу аднаго году – разбор карупцыі. Вяртанне ўласнасці, набытай злачынным шляхам (дзясяткі мільярдаў даляраў) у бюджэт.
5. Рэфармаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання. Рэформа неэфектыўнага тэрытарыяльнага падзелу Беларусі.
6. Ліквідацыя структураў, што паразітуюць на дзяржаўным бюджэце (БРСМ, ідэалагічных аддзелаў, ценавой камерцыі і інш.)
7. Рэформа бюджэту: найбольш грошай – не бюракратам і "сілавікам", а настаўнікам, лекарам і, адрасна, незабяспечаным. Траціну сукупных падатковых паступленняў накіраваць у мясцовыя бюджэты. Дэцэнтралізацыя бюджэтнай палітыкі.
8. Выхад з Мытнага звязу і Еўразійскага звязу. Усталяванне выгадных партнёрскіх эканамічных адносін з бліжэйшымі суседзямі: ЕЗ, Расеяй, Украінай.
9. Рэзкае змяншэнне падатковага цяжару на бізнэс. Зніжэнне ПДВ да 12%. Спрашчэнне бухгалтарскага ўліку.
10. Лібералізацыя банкаўскай сістэмы. Стварэнне рычагоў стымулявання эфектыўнай банкаўскай сістэмы. Увядзенне паўнавартаснай нацыянальнай валюты.

5) «ВЫБАРЫ»

Мы, беларускія хрысціянскія дэмакраты, заяўляем, што:

1. Выбары ў Беларусі не могуць лічыцца дэмакратычнымі, калі яны праходзяць у краіне, дзе існуюць палітычныя зняволеныя.
2. Выбары ў Беларусі не могуць лічыцца празрыстымі ва ўмовах абмежавання правоў палітычных партый і структур грамадзянскай супольнасці, свабоды прэсы, мітынгаў і сходаў.
3. Выбары ў Беларусі не могуць лічыцца законнымі, калі іх вынікі атрыманыя пры дапамозе масавых фальсіфікацый, ва ўмовах няроўнасці палітычных сіл пры фарміраванні выбарчых камісій,



абмежаванні рэальных магчымасцяў забеспячэння кантролю і вядзення назірання за ходам галасавання і падлікам галасоў, а таксама адсутнасці магчымасці правядзення незалежных сацыялагічных даследаванняў і інструментаў рэальнай абароны інтарэсаў выбаршчыкаў і кандыдатаў у судзе.

Мы заяўляем, што сення беларускі народ пазбаўлены права праз свабодныя, дэмакратычныя і справядлівыя выбары самастойна кіраваць сваёй краінай і фарміраваць ўсе ўзроўні ўлады ў краіне.

Для рэалізацыі гэтага права мы патрабуем:

1. Неадкладна вызваліць усіх палітычных вязняў. Спыніць пераслед іншадумцаў па месцы вучобы і працы, забяспечыць вяртанне зволеных і выключаных (у выпадку іх жадання) на ранейшыя месцы працы і вучобы.
2. Зарэгістраваць усе грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі, якім з надуманых прычынаў адмаўлялася ў рэгістрацыі. Унесці ў заканадаўства неабходныя і прызнаныя міжнароднымі арганізацыямі змены, якія спрашчаюць працэдуру рэгістрацыі структур грамадзянскай супольнасці. Адмяніць артыкулы 193-1 і 369-1 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь.
3. Стварыць роўныя ўмовы дзейнасці дзяржаўных і недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Спрасціць сістэму іх рэгістрацыі. Адмяніць незаконныя абмежаванні на іх выданне і распаўсюджванне.
4. Унесці ў Выбарчы кодэкс змены наступнага зместу:
   - Замацаваць абавязковае права палітычным партыям дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў, калі палітычная партыя прыняла рашэнне аб удзеле ў выбарах;
   - Замацаваць права назіральнікаў аглядаць падлік галасоў такім чынам, каб бачыць волевыяўленне грамадзян у кожным бюлетэні, атрымліваць любую інфармацыю, якая тычыцца выбараў, а таксама фіксаваць працэс падліку галасоў наяўнымі ў іх распараджэнні сродкамі; прадаставіць назіральнікам права апячатваць выбарчыя скрыні подпісамі нароўні з чальцамі выбарчых камісій;
   - Вызначыць падставы, якія даюць выключнае права на датэрміновае галасаванне і галасаванне па месцы жыхарства (дакументальна пацверджаная камандзіроўка, адпачынак, ад'езд на лячэнне, пацверджанне медыцынскай даведкай стану здароўя, якое перашкаджае выбаршчыку асабіста наведаць ўчастак у дзень выбараў);
   - Замацаваць на практыцы асобны празрысты падлік па кожным з відаў галасавання і кожнай з выкарыстаных падчас галасавання скрыняў, а таксама адлюстраванне вынікаў раздзельнага падліку галасоў у выніковым пратаколе;
   - Замацаваць права судовага абскарджання любых рашэнняў выбарчых камісій усіх узроўняў.

З'езд партыі БХД даручае Нацыянальнай Радзе БХД:

1. Падрыхтаваць і правесці кампанію актыўнага байкоту «выбараў», альбо ў выпадку выканання вышэйпералічаных патрабаванняў, ўдзелу хрысціянскіх дэмакратаў у палітычнай кампаніі;
2. Правесці перамовы з іншымі дэмакратычнымі сіламі Беларусі і арганізаваць супольныя палітычныя кампаніі дзеля выканання гэтых патрабаванняў.

6) АБНАЎЛЕННЕ ПАРТЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ



Праграма БХД пасля 5 гадоў сталення Партыі і перад новымі выклікамі для хрысціянскай дэмакратыі на Беларусі мае патрэбу ў абнаўленні. На працягу 1 года нам патрэбна падрыхтаваць, а на наступным З'ездзе прыняць абноўленую

праграму Партыі. Для рэалізацыі гэтага неабходна:

1. Стварыць працоўную групу па перапрацоўцы і абнаўленні партыйнай праграмы
2. Склікаць партыйную Канферэнцыю, на якой будуць прадстаўленыя і абмеркаваныя абноўлены варыянт партыйнай праграмы. У якасці скрайняй даты правядзення партыйнай Канферэнцыі вызначыць снежань 2012 г.
3. У абнаўленні і перапрацоўцы праграмы БХД узяць арыенцір на пашырэнне «народнага» ідэйнага складніка з умацаваннем хрысціянска-дэмакратычнага стрыжня праграмы для пашырэння падтрымкі партыі сярод шырокіх колаў беларускага грамадства.
4. Узяць за аснову дзейсную Праграму і раздзел «Дзяржаўна-палітычны лад», прыняты на III З'ездзе БХД 12 верасня 2010 г.

7) 100 ГОД БХД

Праз 5 гадоў, у 2017, спаўняецца 100 гадоў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Сустрэць гэтыя ўгодкі нам трэба годна: з кнігай пра «Стагоддзе БХД», шырокім ушанаваннем памяці бацькоў-заснавальнікаў Партыі (Адама Станкевіча, Вінцэнта Гадлеўскага, Яна Пазняка, Станіслава Глякоўскага, Канстанціна Стаповіча, Язэпа Германовіча, Фабіяна Абрантовіча, і іншых), навуковымі канферэнцыямі і конкурсамі. Падрыхтоўку трэба распачынаць ужо зараз. Але, безумоўна, найлепшым адзначэннем юбілея для БХД будзе – прыйсці да ўлады ў Беларусі і пачаць ператварэнне дзяржавы на аснове праграмы БХД.





Сэрца Народнай Партыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі – гэта хрысціянскія, маральныя каштоўнасці. Мы перакананыя: Беларусь будзе сапраўды вольнай, моцнай і заможнай толькі на грунце хрысціянскіх прынцыпаў і беларускага патрыятызму. Выбіраючы тактыку і стратэгію, мы павінны памятаць: праўда, свабода і справядлівасць у рэшце рэшт перамагаюць.

Жыве Беларусь –
Жыве з Богам!

17.12.2011, Менск



Шаноўныя браты і сёстры!

Калі Вы жадаеце атрымліваць бясплатную штомесяцовую рассылку БХД (чарговы нумар газеты «Крыніца«, буклеты, узоры для збору подпісаў і г.д) – калі ласка, паведамце нам праз пошту

220123, г. Мінск, а/с 324,

ці e-mail: **bchd.mail@gmail.com**

або тэлефон – **8 029 1673435 (Марына)**.

Незалежнае інфармацыйнае выданьне
Заснавальнік і выдавец: цэнтр«Сьветач«
Надрукавана на ксераксе п. М.Кухты Наклад: 299 ас.
Галоўны рэдактар: Павал СЕВЯРЫНЕЦ

Аб'ём: 8 палосаў А4. Падпісана ў друк 15 снежня 2011г.
Тыражаваньне і распаўсюд усімі зацікаўленымі асобамі дазваляецца і вітаецца.
Распаўсюд бясплатны.